# АФАРМЛЕННЕ ІДЭАЛАГІЧНЫХ ІНСТЫТУТАЎ РАСІЙСКАГА САМАДЗЯРЖАЎЯ Ў КАНЦЫ XVIII — ПАЧ. XIX ст. І АСАБЛІВАСЦІ ІХ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ

***А. І. Баргдановіч***

У канцы XVIII ст. ідэалогія была досыць новым паняццем. Менавіта у год смерці Кацярыны II у 1796 г. тэрмін «ідэалогія» быў упершыню уведзены у навуковы зварот французскім мысліцелем Дэсцютам дэ Трасі. Пад ідэалогіяй ён разумеў агульную тэорыю ідэй мысліцеляў свайго часу. Ен імкнуўся стварыць методыку з дапамогай якой можна даследаваць прыроднае паходжанне ідэй і развенчваць ілюзорныя думкі і тэорыі. У XIX ст. да тэрміна «ідэалогія» таксама адносіліся крайне негатыўна. Рэвалюцыйныя ўзрушэнні таго часу паказалі, як на алтарах ідэалагічных абстракцый адбываецца закланне жывых людзей. Трактоўка ідэалогій у канцы XVIII — першай трэці XIX стст. злучалася з адарванай ад рэчаіснасці гульнёй думкі, спекулятыўнымі, абстрактнымі канструкцыямі або з дэмагогіяй. Аднак, нягледзячы на гэта ідэалогія, як і ідэалагічныя інстытуты, якія фарміравалі светапогляд чалавека, існавала задоўга да таго як з'явіўся тэрмін яе вызначаўшы.

Уключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі пачалося ў гады праўлення Кацярыны II з 1772 г. Перыяд з 1772 па 1796 гг. можна разглядаць як кацярынінскую эпоху ў Беларусі. У гады кіравання Кацярыны II Расійкая імперыя знаходзілася ў заключнай стадыі свайго будаўніцтва. У той час не толькі ідэалогія, але і іншыя складаючыя дзяржавы ўяўлялі сабой будаўнічую пляцоўку, дзе пануе некаторы хаос, характэрны для завяршэння будоўлі. Пётр I пачаў будаўніцтва імперыі — Кацярына II яго завяршыла. Пры кіраўніках, якія правілі паміж гэтымі манархамі, Расійская імперыя ператварылася у доўгабуд, дзе не клапаціліся аб завяршэнні будаўніцтва, а толькі раскрадалі будаўнічыя матэрыялы і абсталяванне. Нават самая лепшая з іх, Елізавета Пятроўна, больш клапацілася аб бальных сукенках,

чым аб стане дзяржавы. Таму надпіс на помніку Пятру I, што паставіла Кацярына II у Пецярбургу, цалкам справядлівы: «Пятру Першаму. Кацярына Другая». Гучыць гэта так, быццам за Пятром I адразу правіла Кацярына II, быццам іншых імператараў наогул не існавала.

Для таго, каб стварыць ідэалагічныя інстытуты і распачаць мэтанакіраваную ідэалагічную работу, трэба было правесці пэўныя пераўтварэнні ў грамадстве, якія і распачаў Пётр I. Ён разглядаў царкву як перашкоду ў ажыццяўленні адзінаўладдзя. Каб раз і назаўжды зрабіць свецкую ўладу ў Расіі вышэй за царкоўную Пётр пасля смерці патрыярха Адрыяна, не дапусціў абрання новага. На чале царквы ён паставіў Свяцейшы Сінод — калегію вышэйшых царкоўных іерархаў, якую ўзначальваў свецкі чыноўнік — обер-пракурор. Свяцейшы Сінод становіцца царкоўна-свецкай дзяржаўнай установай, своеасаблівым міністэрствам па царкоўных справах, якое кіруе царквой і выконвае волю самадзержца.

Такім чынам, пры Пятры I царква перастала быць нейкім аўтаномным утварэннем унутры Расіі, якое жыве па сваіх законах і нават мае свае ўзброенныя сілы (маюцца на увазе патрыяршыя стральцы). Дзякуючы Пятру I праваслаўная царква стала дзяржаўнай установай, адной з важнейшых функцый якой было правядзенне ідэалагічнай палітыкі самадзяржаўя. Праўда, у той час ідэалагічная палітыка, як і ідэалогія расійскага самадзяржаўя толькі афармляліся.

Кацярына II прадоўжыла пачатыя Пятром I пераўтварэнні ў гэтым напрамку. У 1764 г. сваім указам яна правяла секулярызацыю царкоўных уладанняў, ў выніку чаго каля 2 мільёнаў манастырскіх сялян былі перададзены дзяржаве і падпарадкаваны Калегіі эканоміі. Гэта забяспечыла дадатковае паступленне ў казну 1,4 млн. рублёў, менш паловы з якіх адпускалася непасрэдна на ўтрыманне цэркваў, манастыроў, шпіталяў і багадзельняў. Акрамя таго, імператрыца ўстанавіла

для кожнага манастыра дакладную колькасць манахаў. Больш паловы манастыроў была ўвогуле зачынена [1, с. 317-318].

Пры Кацярыне II обер-пракурорам Свяцейшага Сінода стаў рэктар Маскоўскага ўніверсітэта прафесар Ян Мелісіно, які прапанаваў праект, рэалізацыя якога наблізіла б праваслаўную царкву да пратэстанцкай. Вось асноўныя палажэнні гэтага праекта:

1. Надаць свабоду веравызнання іншаземцам, запрошаным урадам у Расію;

2. Дазволіць раскольнікам публічна ажыццяўляць свае набажэнствы і мець сваё духавенства.

3. Паслабіць і скараціць пасты.

4. Выправіць кормчую кнігу.

5. Ачысціць царкву ад забабонаў і «няшчырых» цудаў. А для разбору гэтай справы скласці спецыяльную камісію «з розных не аслепленых забабонамі асоб».

6. Адмяніць звычай нашэння ікон па хатах.

7. Адмяніць складзеные ў познія часы стыхіры, каноны, трапары і інш. Адмяніць шматлікія залішнія святочныя дні; замест вячэрняў і ўсяночных прызначыць кароткія маленні з карыснымі павучаннямі для народа.

8. Спыніць утрыманне манахаў, якія не прыносяць карысці і перадаць сродкі на іх утрыманне на карысць адукаваных святароў і прапаведнікаў, іх жа ставіць і на архірэйскія кафедры.

9. Біскупам па прадпісанні апостала «з законнымі жонкамі сожитие мець».

10. Дазволіць духавенству нашэнне «больш прыстойнага адзення».

11. Зусім адмяніць звычай памінання нябожчыкаў. Падобны звычай толькі дастаўляе духавенству лішнюю нагоду да розных вымагальніцтваў.

12. Дазволіць шлюбы з іншаверцамі.

13. Забараняць прычашчэнне немаўлят да 10-гадовага ўзросту [2, с. 148].

Як відаць, гэты праект да крайнасці рацыяналізаваў царкву. Яна станавілася таннай, з простай абраднасцю і дэмакратычнымі законамі. А пункты 7 і 8 прыведзенага праекта ўвогуле рабілі яе вельмі добра прыстасаванаай для правядзення ідэалагічнай палітыкі дзяржавы ў народзе. Нягледзячы на падтрымку гэтага праекта прыдворнымі коламі, Кацярына II не пажадала яго ажыццявіць, бо справядліва прадбачыла магчымы раскол у грамадстве.

Зніжэнне ўплыву царквы неабходна было кампенсаваць. Гэта абумовіла з'яўленне ў Расійскай імперыі новых ідэалагічных інстытутаў. Імі становяцца адукацыя, навука, літаратура і перыядычны друк.

З першых гадоў праўлення Кацярына II пачала рэалізоўваць свае выхаваўчыя ідэі, якія сфарміраваліся пад уплывам ідэй Асветніцтва [3, с. 332]. Па яе загаду была створана «Камісія аб вучылішчах і апекавання патрабуючых». У маі 1768 г. камісія склала і прадставіла імператрыцы праект стварэння чатырох груп навучальных установ: 1) ніжэйшых вясковых вучылішчаў; 2) ніжніх гарадскіх вучылішчаў; 3) сярэдніх вучылішчаў; 4) вучылішчаў для іншаверцаў. У аснову першых двух была пакладзена ідэя абавязковасці элементарнага навучання для ўсяго мужчынскага насельніцтва, якое, на думку складальнікаў, павінна ажыццяўляцца мясцовым духавенствам або свецкімі настаўнікамі па падручніках, выдадзеных Свяцейшым Сінодам. Нагляд за школамі ўскладаўся на духавенства, выбарных прадстаўнікоў дваранства, а галоўнае загадванне — на архірэяў і губернатараў.

Статут народных вучылішчаў уводзіў праграмму навучання, у якой галоўнае месца адводзілася вывучэнню агульнаадукацыйных прадметаў, а таксама асновам «христианского закона і благочестия» («Кароткі катэхізіс» і «Свяшчэнная гісторыя»). Адносіны настаўніка да дзяцей павінны былі грунтавацца на новых педагагічных ідэях, прыхільніцай якіх была імператрыца.

Новая школа ў якасці асноўнай задачы ставіла грамадзянскае выхаванне. Замест дэвіза «прафесійны работнік», які быў асноўнай мэтай адукацыйнай сістэмы часоў Пятра I, Кацярына II прапанавала новы тэрмін — «чалавек-грамадзянін». Агульная адукацыя і выхаванне чалавека-грамадзяніна аб’яўлялася мэтай новых навучальных устаноў. У статуце народных вучылішчаў упершыню давалася азначэнне грамадзянскіх дабрадзецеляў: адданасць праваслаўнай веры, самадзяржаўю і іх адзінства з народам. Менавіта гэтыя ідэі ў XIX ст. былі ўвасоблены графам С. Уваравым у лозунгу «Праваслаўе. Самадзяржаўе. Народнасць», які і вызначыў афіцыйную ідэалогію Расійскай імперыі.

Першая газета ў Расійскай імперыі «Ведомости» была створана указам Пятра I. Яна выходзіла з канца 1702 г. у Маскве, а з 1715 г. і ў Пецярбурзе. Газета прызначалася для прапаганды і тлумачэння знешняй і ўнутранай палітыкі, наватарскіх рэформ, якія праводзіў цар. Перыядычны друк спачатку быў малапрыкметным і слабаўплывовым, а тыражы газет невялікімі. Паступова ён развіваўся і пераўтвараўся ў значную сілу грамадска-палітычнага жыцця. Больш чым паўстагоддзя існавала поўная дзяржаўная манаполія на друк. Расійскі ўрад непасрэдна і праз пасрэдніцтва Акадэміі навук кіраваў ім. Асноўны змест газеты складалі інфармацыйныя матэрыялы і афіцыяльныя паведамленні. Тэматыка выступленняў шырокая — ад палітычных навін да інструкцыі па пабудове лодкі.

З узыходжаннем на трон Кацярыны II пачалася новая паласа ў справе выдання часопісаў. Менавіта пры ёй пачаліся выдавацца сатырычныя часопісы. Першы з іх, штотыднёвік «Всякая всячина» з’явіўся ў 1769-1770 гг. Імператрыца была не толькі ініцыятарам, але галоўным рэдактарам і актыўным аўтарам свайго выдання. «Всякая всячина» абвясціла сябе «бабуляй» рускіх часопісаў, закліканых выхоўваць не толькі чытачоў, але і вучыць журналістаў таму, што можна крытыкаваць, а якія тэмы наогул нельга закранаць. У часопісе прытрымліваліся пункту

гледжання, што высмейваць трэба парокі, а не іх носьбітаў. Таму сатыра ў ім была бязлікай і не закранала сур’ёзных сацыяльных і палітычных праблем. Вопыт імператрыцы абудзіў да жыцця шэраг прыватных сатырычных часопісаў: «И то и се», «Ни то ни сё» «Смесь», «Адская почта», «Парнасский щепетильник» і г.д.

Асаблівай з’явай перыядычнага друку Расіі канца XVIII ст. былі часопісы М. І. Навікова. Яны былі першымі выданнямі, дзе пачалі пісаць аб палітыцы і эканоміцы, абмяркоўваць праблемы прыгоннага права і іншыя вострыя пытанні, якія не знаходзілі адлюстравання ў афіцыйным дзяржаўным друку, якія спрыялі руху рускай літаратуры да рэалізму. Аднак большасць з іх з-за цэнзурных перашкод і ганенняў з боку ўладаў праіснавалі нядоўга [4, с. 162]. Цэнзура пільна сачыла нават за тэматычнымі выданнямі, якія насілі пазнавальны характар і не закраналі грамадска-палітычных пытанняў.

У беларускіх землях пазіцыі створаных пры Кацярыне II ідэалагічных інстытутаў аказаліся больш слабымі ў параўнанні з цэнтральнымі абласцямі Расіі ў сілу наступных абставін: амаль поўны кантроль сістэмы адукацыі ў краі ўніяцкай і каталіцкай цэрквамі, слабасць пазіцый праваслаўнай царквы, слабая папулярнасць сярод мясцовага насельніцтва расійскага перыядычнага друку, панаванне польскамоўнай перыёдыкі, адукацыі і польскамоўнага чыноўніцтва.

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі расійская ўлада ўзяла на сябе абавязак ахоўваць свабоду каталіцкага веравызнання. У трактаце па выніках другога падзелу Рэчы Паспалітай ад 11 ліпеня 1793 г. Кацярына II абвясціла за сябе, «…и наследников преемников своих… оставить римских католиков обоих церковных обрядов (католического и греко-католического) на вечные времена при спокойной принадлежности преимуществ, собственности и церквей, при свободном отправлении их богослужения и церковного порядка и при всех правах к оному принадлежащих». Адзінай умовай было прынясце прысягі на вернасць імператрыцы. Пасля прысягі

землеўласнікам пакідалася зямельная маёмасць, а на каталікоў распаўсюджваліся правы жыхароў Расіі.

Нягледзячы на тэкст трактата, царскі ўрад імкнуўся захаваць намінальны кантроль над каталіцкай царквой. Кацярына II указамі ад 14 снежня 1772 г., 26 студзеня 1782 г. і 6 верасня 1795 г. забараніла абвяшчаць у імперыі папскія булы без папярэдняга іх прагляду. Указамі ад 3 ліпеня 1779 г., 9 студзеня 1780 г., 28 лютага 1784 г. і некаторымі іншымі яна абмежавала, а потым і наогул забараніла ўсякія сувязі каталіцкага духавенства з замежжам і загадала выконваць загады толькі імператарскай улады і Сенату. Усе спробы Рыма наладзіць кананічныя сувязі з касцёлам у Расіі разглядаліся ўладамі як спроба ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы імперыі. Аднак гэтыя ўказы часта не выконваліся, бо дзяржаўныя органы і Свяцейшы Сінод баяліся настроіць супраць сябе каталіцкае духавентва і вернікаў каталіцкай канфесіі [5, с. 120].

Рэлігіяй правячай эліты Беларусі — шляхты ў той час заставалася каталіцкае веравызнанне, а верай большасці насельніцтва Беларусі — уніяцтва, таму дзяржаўная палітыка у адносінах да іх была асцярожнай і лаяльнай. Пры Кацярыне II уніяцкая і каталіцкая цэрквы маглі праводзіць і праводзілі ідэалагічную апрацоўку насельніцтва не на карысць Расійскай імперыі, а на карысць Ватыкана.

Каталіцкая царква аказвала моцны ідэалагічны ўплыў на насельніцтва Беларусі праз сістэму адукацыі, якая пераважна знаходзілася ў руках каталіцкай і грэка-каталіцкай цэркваў. Плённа працавалі навучальныя ўстановы ўсіх асноўных уніяцкіх і каталіцкіх ордэнаў базыльян, езуітаў і піяраў.

Пасля далучэння да Расійскай імперыі ордэн піяраў захаваў свае вядучыя пазіцыі ў школьнай справе на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Такое становішча працягвалася да 1832 г., калі быў зачынены Віленскі універсітэт і сетка сярэдніх і пачатковых навучальных устаноў, якія працавалі на польскай мове.

Расійскі ўрад ставіўся да каталіцкіх навучальных устаноў з недаверам. Так, у 1794 г. Кацярына II пісала князю М. В. Рапніну, што піярскія школы дрэнна ўплываюць на моладзь, таму трэба ўстанавіць за імі добры нагляд. Але далей простага пажадання, відаць, справа не ішла, і піярскія школы па-ранейшаму займалі вядучае месца ў Віленскай навучальнай акрузе. Да 1832 г. іх колькасць пастаянна расла. Калі ў 1803 г. у піярскіх вучылішчах займалася 1 234 вучні, то ў 1822 г. больш за 1 400. Полацкае вышэйшае піярскае вучылішча замяніла сабой зачыненую ў 1822 г. полацкую езуіцкую акадэмію. Яно паспяхова працавала да польскага паўстання 1830 г. [6, с. 84].

У канцы XVIII ст. базыльяне разгарнулі шырокую дзейнасць па адукацыі ў сваіх калегіях свецкай моладзі. У гэты час працавала 19 базыльянскіх калегій. Да Літоўскай правінцыі базыльян належала 9 з іх, а да Рускай — 10. У гэтых школах звычайна выкладалі 4-10 прафесараў, а лічба вучняў вагалася ад 100 да 250. Праграма была прыкладна такая ж, як ў піярскіх і езуіцкіх школах, вывучаліся таксама нямецкая і французская мовы. Большасць вучняў паходзіла з шляхецкіх семъяў, але даволі высокі працэнт сярод іх складалі святарскія сыны, што рыхтаваліся да святарства, а таксама мяшчанскія дзеці. Некаторыя школы былі заснаваныя спецыяльна для святарскіх сыноў, таму ў іх дадаткова выкладаліся старaславянская мова і тэалогія.

Базыльяне ўтрымлівалі таксама і парафіяльныя пачатковыя школы, у кожнай з якіх якіх навучалася не менш як па 20 вучняў. У 1773 г. у Рускай правінцыі такія школкі існавалі амаль ў кожным манастыры, а ў Літоўскай — у кожным трэцім.

Што тычыцца езуітаў, то пад час праўлення Кацярыны II, яны падверглі мясцовае насельніцтва сапраўднаму ідэалагічнаму прэсінгу, які спрыяў паланізацыі і каталіцызацыі шляхецкай моладзі. Нават пасля апошняга падзелу ў Беларусі заставаліся езуіцкія калегіі ў Полацку, Віцебску, Оршы, Магілёве, Мсціславе. Адна з іх, Полацкая, ў 1812 г. стала акадэміяй. Але больш

важную ролю ў захаванні высокага статусу каталіцкай царквы адыгрывалі езуіцкія місіі.

Асабліва актыўную місіянерскую дзейнасць езуіты разгарнулі на Магілёўшчыне там, дзе праваслаўная царква мела мацнейшыя пазіцыі, чым дзе-небудзь на Беларусі. Езуіцкія місіі былі адчынены ў Гомелі, Хальчу, Чачэрску і Шарсціне. Некаторыя з іх дзейнічалі да самага выгнання ў 1820 г. езуітаў з Расійскай імперыі. Пад час місіі вяскоўцы вучылі малітвы і спевы. Пасля гэтага вывучалі галоўныя дагматы веры і хрысціянскія абавязкі. Місія доўжылася не менш як тыдзень і заканчвалася споведдзю і Святой камуніяй [5, с. 123].

Такім чынам, у кацярынінскую эпоху закладваецца аснова фарміравання ідэалогіі Расійскага самадзяржаўя. Склаліся асноўныя перадумовы для стварэння ідэалагічных інстытутаў Расійскага самадзяржаўя. У гэты час да ідэалагічнай работы ужо былі прыстасаваныя праваслаўная царква, дзяржаўная сістэма адукацыі і перыядычны друк. Выключная роля ў станаўленні ідэалагічных інстытутаў належыла вялікім расійскім рэфарматарам XVIII ст. Пятру I і Кацярыне II, якія ажыццявілі трансфармацыю Расіі ў еўрапейскую дзяржаву. Аднак на далучаных да Расіі беларускіх землях ідэалагічныя інстытуты расійскага самаўладдзя дзейнічалі абмежавана. Фактычна нават адбылося адноснае ўзмацненне пазіцый каталікай царквы і польскага ідэйнага ўплыву на падрастаючае пакаленне. Гэты ўплыў ажыццяўляўся праз сістэму навучальных устаноў, створанаую тут каталіцкімі і грэка-каталіцкімі манаскімі ордэнамі, а таксама езуіцкія місіі. Царскі ўрад не адразу ацаніў магчымасці ідэалагічнай прапаганды ў справе ўмацавання свайго высокага статусу на далучаных землях. Па-першае, гэта адбылося з-за недаацэнкі магчымасцей праваслаўнай царквы і сістэмы адукацыі, як ідэалагічных інстытутаў і, па-другое, баязню выклікаць незадавальненне і ўзброенае супраціўленне шматлікай спольшчанай мясцовай шляхты.

***Крыніцы і літаратура***

1. Павленко, Н. И. История СССР с древнейших времен до 1861 г. / Н. И. Павленко, В. Б. Кобрин, В. А. Федоров. — М.: Просвещение, 1989.

2. Карташов, В. С. История русской церкви. В 4-х т. / В. С. Карташов. — СПб.: Стомма, 2001. — Т. 2.

3. Серков, А. И. История русского масонства / А. И. Серков. — СПб., 1997.

4. Козлова, М. М. История отечественных средств массовой информации / М. М. Козлова. — М.: Мысль, 1988.

5. Васькоў, У. Каталіцтва ва ўсходняй Гомельшчыне / У. Васькоў // ARCHE. — 2007. — № 12 (63).

6. Грыцкевіч, А. Рэлігійная і свецкая адукацыя / А. Грыцкевіч // Наша вера. — 2002. — № 3 (21).

## НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМНЫХ ДАКУМЕНТАХ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БСДП)

***А. Г. Багдановіч***

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (БСДП), што ўзнікла летам 1918 г. ў выніку расколу БСГ, на працягу ўсёй сваёй нядоўгай гісторыі паслядоўна выступала за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа, рашуча адмаўляючы гвалтоўныя метады барацьбы. Ключавое месца ў стратэгіі і тактыцы беларускіх эсдэкаў займала нацыянал-дзяржаўнае пытанне. Па сутнасці, гэта была спроба спалучэння класічнага марксізма з традыцыямі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. У сваіх палітычных дэкларацыях, у тым ліку і ў праграме, лідэры БСДП імкнуліся прыстасаваць ідэі сацыялізма да канкрэтна-гістарычных умоў сялянскай Беларусі.

Праца над праграмай БСДП пачалася ў 1918 г. У 1920 г. яна была надрукавана [1, с. 17, 22-24]. Па сведчанні вядомага гісторыка М. Сташкевіча, у падрыхтоўцы праграмы беларускай